ДАЛЁКІЯ, недасяжныя зоры глядзяць на зямлю з цёмнага бяздоньня ночы, трэпетна дрыжаць і палошчуцца ў асьвечаных сярпом месяцу хмарах. Недзе ў канцы вёскі зьвініць у марозным паветры бадзёры юнацкі голас, потым раптам абрываецца, растанеўшы ў ледзь прыметным подыху ветра. І зноў старожкая маўклівая цішыня агортвае рэдкія позьнія агні вясковых хат.

Трэцюю ноч пільнуе ў гумне зайца Пятрок Шыкун. Калі глыбокі сьнег выбяліў шэрую зямлю, пакрыў тоўстым пластом жытнюю рунь, шаракі, часта прысядаючы ў старожкім адшукваньні небясьпекі, пацягнуліся да сядзібаў. Там, у падстрэшшы гумнаў, трашчаў на марозе сваімі сухімі струкамі лубін. А гэта добрая папаска для зайца, калі больш спажыўнейшы корм на шырокім раздольлі палеткаў затануў у белай засьцелі сьнегу.

— Цяпер ня буду лапцей драць, ганяючыся за зайцамі па купчастым балоце,—сказаў свайму бацьку Пятрок, дваццацічатырох гадовы хлапец.—Самі пад дубальтоўку прыдуць. Адно, сядзі ў гумне ды ніжы іх праз шчыліну шротам. Летась я з гэткага паляваньня дзесяць скурак у саюз даставіў.

Стары Шыкун, закручваючы завяратню ў санях, прахрыпеў пракуранымі махоркай лёгкімі:

— Толькі глядзі, каб ніхто аб гэтым не даведаўся. Даведаюцца, брахнуць каму трэба, што не па закону б'еш зьвярыну—будуць тады і зайцы і скуркі. Цяперашняму сьвету няма чаго верыць.

Пятрок упэўнена пацiскаў плячыма:

— Летась ніхто аб гэтым ня ведаў, тое і сёлета будзе. А калі хто і пачуе стрэл ноччу, мала чаго можна нагаварыць, па чым страляў.

І калі начныя цені слаліся па зямлі, хаваючы ў неадчуванай на вобмацак імгле бліжэйшы лес, ён ішоў у гумно і садзіўся, прыставіўшы да сьцяны стрэльбу на прыгатаваны ўдзень заслон. Сядзеў ціха, прыпаўшы стомленымі ад цемені вачмі да невялікай празы ў сьцяне. Растыканыя ў сьнезе воддаль ад гумна пукі лубіну праз некаторы час вырасталі ў вялізныя фантастычныя фігуры, якія калыхаліся нават у ціхае надвор'е, перабягалі з мейсца на мейсца. Здавалася, сабраўся гурт зайцоў, якія, не адчуваючы небясьпекі, што захована за дрыўлянымі сьценамі будынку, з асалодаю хрумстаюць галоднымі зубамі сіняватыя, з шэрымі кропачкамі, зярняты лубіну. Тады, смакуючы блізкую ўдачу, дрыжачыя рукі Пятра мацалі ў цёмені халодную сталь ствалоў. У вушшу зьвінела ад ледзь стрымана напружаньня. Недасяжныя да чалавечага вуха тонкія шолахі прыроды грымелі ў галаве.

Пятрок яшчэ раз глянуў у проразь, і крывая ўхмылка расчараваньня скрывіла яго рот. Ня было ніякіх зайцоў, якія ён бачыў перад гэтым. Стомленыя напружаным углядаьнем у невялічкую проразь сьцяны вочы маглі ўявіць у чарнаце ночы і ня гэта!

Так праседжваў ён гадзіны тры. Зайцы ня прыходзілі. Тады Пятрок уставаў з заслону, паднімаў уверх брыль шапкі, які насоўваўся на вочы, потым, пастаяўшы, ня рухаючыся, хвілін пяць, зноў з смутнай надзеяй глядзеў на той бок сьцяны. Але маўклівыя пукі лубіну стаялі на мейсцы і каля іх ня было ніякае жывое істоты.

Раніцаю, даючы трушанку каровам, Пятрок аглядаў прыладу і пасьля злосна пляваў на прытоптаны заечымі лапкамі сьнег. Яны былі тут ноччу, калі Пятрок спаў, ці ў час вячэры ў хаце.

— Зайцы нейкія хітрыя ў гэтым годзе завяліся,—казаў ён бацьку, трасучы вілкамі харч каровам.—Колькі ні сяджу—баяцца падыходзіць. Як толькі пайду дахаты, іх тут цэлая плойма выкручваецца. Хіба, можа, пад дзень сюды прыйсьці?

— Прыбягуць яны і пад вечар! Зайцы чуюць, як порахам пахне дубальтоўка нават за вярсту. Тады іх і калом не загоніш. Выцяры ствалі хваёвымі калючкамі, тады ўсякі парахавы пах як рукою здыме. Я гэтак заўсёды рабіў, калі йшоў на засаду, і заўсёды меў удачу.

На чацьвертыя суткі засады туманна зачарнеў на прыдушаным начною імглою сьнезе нейкіе жывы клубок. Застыў, выкаціўшыся з-за недалёкіх могілак, кроках у пяцідзесяці. Ён то вырастаў да вышыні стогу сена, то зьмяншаўся і зьнікаў зусім, калі ў вочы Пятру тупа біла напружаная начная цемень.

Заяц, мусіць адчуваў блізкасьць чалавека, бо баяўся падыходзіць да гумна. Круціўся воддаль, праслухоўваючыся, стаўшы на заднія лапкі, да начных шолахаў.

Тугі гул стрэлу разарваў спакой зімняе начы. Нулёўка працяжна застагнала ў паветры, і дзіцячапалахлівы плач зайца кальнуў Пятру ў вушы.

— Во калі, браце, нарваўся ты на мяне!—марматаў ён, даганяючы падбітага зайца.—Каб віднейшай была ноч, я табе ня гэтак бы зажылiў!

Пасьля некалькіх удараў аб вушак гуменных дзьвярэй, шарак уздрыгануўся ў сьмяротнай сударзе і пярэднія лапкі бязвольна зьвісьлі на вушастую галаву. Зьверху, прытаіўшыся за рэдкімі хмарамі глядзелі на бялеючую сьнегам зямлю маўклівыя зоры

Ледзь прыметны подых ветра палыхнуў па драўляным шчыце гумна і ў момант з нік, зьдзівіўшыся сваёй адвазе будзіць урачысты спакой задуменнае ночы.

„Цяпер ночы дзьве не пайду ў гумно,—падумаў Пятрок.—Няхай прызвычайваюцца шаракі. А пасьля, калі пачну лузаць - добры будзе заробак“.

* * *

За шэсьцьдзесят крокаў ад гумна была дарога. Калі восеньню вуліца вёскі была падобна на брудны кісель ад частых дажджоў, гаспадары езьдзілі па загуменьню. Потым нехта пралажыў сьлед саньмі па сьнезе і з таго часу па-загуменьнем пачалі езьдзіць усе.

Два дні Пятрок не заглядваў на гумно. Быў заняты вывазкаю дроў з лесу. Увечары хадзіў на попрадкі да дзяўчат. Жартаваў з іх маруднае работы і ўсё бліжэй падсядаў да свае каханкі Паромчыкавае Антаніны.

— Ці хутка ты, Пятрок, пачнеш жаніцца?—сьмяяліся дзяўчаты.—Мы чулі, што ты хочаш гэта цішком зрабіць. Нядобра так няўважліва адносіцца да старых знаёмых.

Антаніна чырванела, што гэтыя словы закідваюць і па яе адрасу. Каб захаваць ад сяброўак сваю саромлівасьць, быццам неспадзявана выпушчала з рук верацяно, пасьля некаторы час шукала яго, не паднімаючы галавы.

Разыходзіліся позна. З жартамі і няўцішным сьмехам губляліся ў цемені паасобныя постаці людзей. Ноч моўчкі прыслухоўваліся да гэтага шуму. Мутным сьвятлом дрыжэлі зоры ў небе.



...Чырвоны сноп агня бліснуў ад гумна... Антаніна бяз стогну асела на мяккі сьнег...

Ужо каля сваёй хаты Антаніна ўспомніла, што яна абяцала пабачыць сёньня хворую цётку, якая пражывала ў вёсцы Іванічы.

— Ты мяне правядзеш да цёткі?—спытала Антаніна ў Пятруся.—Што табе абыходзіць прайсьціся з вярсту. Мне казалі, што цётцы вельмі дрэнна і яна бадай ці выжыве да заўтрага.

— Добра, я цябе правяду, але праз гадзіны дзьве ці тры зноў прыду. Цётка твая, як я чуў, хварэе на нейкую заразьлівую хваробу і табе ня варта там заставацца нанач.

Калі яны праходзілі каля гумна Пятруся, апошняму здалося ў цемені, што ад прынады пакульгаў павольна ў бок заяц.

„Прызвычаліся, што і людзей не баяцца“, падумаў Пятрусь.—„Правяду Антаніну, а пасьля прыду папільную крыху. Мо што часамі і набрадзе“.

Зьвярнуўшыся да хаты, ён абмацаў на сьцяне стрэльбу. Потым пачаў шукаць у шуфлядзе патронаў. Стары заварушыўся на ложку і спытаў санлівым голасам:

— Ты гэта куды зьбіраешся? Зайцоў пільнаваць?

— Пайду пасяджу крыху. Толькі што спудзіў зайца каля лубіну. Ен павінен зноў прыбегчы.

— Лепш пасьпі,—абазваўся бацька. — Досьвіта трэба ў лес ехаць, а цябе не дабудзішся. Пасьля дроў будзеш пільнаваць хоць усю ноч.

— Я не надоўга,—ужо з-за парогу прагаварыў Пятрусь.—Не замыкайце толькі дзьвярэй, каб пасьля ня бразгаць.

У гумне ціха рыпнуў дзьвярмі. Адшукаў у цемені заслон і, трымаючы ў руках стрэльбу, выглянуў праз прорэзь. Ледзь прымеціў прынаду.

„Чэрці яго тут разьбяруць дзе заяц, а дзе лубін“,—падумаў ён,—„Выдалася ночка яшчэ цямнейшая за ранейшыя“.

Прасядзеў з гадзіну. Пасьля пачуў, як нехта лёгка прахрусьцеў ля самай сьцяны па сьнезе. Зноў усе сьцішала. Потым затрашчэў лубін, што стаяў у падстрэшшы.

— Ах, каб ты здох!—амаль голасна вылаяўся Пятрусь.—Мала яму прынады, дык ён да снапоў прыкульгаў.

Пятрусь прыпаў да шчыліны, мяркуючы, ці можна выстраліць у зайца. Але вузкая прорэзь не давала магчымасьці разгледзець, дзе быў шарак.

Пачуўшы шолах у гумне, заяц адскочыў у бок. Пастаяў крыху, потым пакульгаў да прынады.

З захаду нацягнула хмары і цемень пашарэла ад лёгкіх сьняжынак. Усе рэчы зьліліся ў адну шэрую твань і нельга было распазнаць таго, што раней хоць крыху было прыметна на белай засьцелі сьнегу. Калі, гледзячы праз шчыліну, Пятрусь яшчэ распазнаваў зайца, дык, узяўшы вокам поверх ствалоў ён губляў цэль, і вочы сьляпіліся ад вострага напружаньня.

Некалькі разоў ён прынікаў тварам да ложа і зноў адрываўся, шкадуючы выпусьціць набой на вецер. Яшчэ раз глянуў праз прорэзь сьцяны і пасьля гэтага зразу-ж прыткнуў да пляча ложа дубальтоўкі—быццам у нейкай туманнай далячыні нешта павольна рухалася ўздоўж гумна.

„Далёка ці блізка—выстралю,—кальнула ў галаве, і Пятрусь нэрвова рвануў за спуск...

Янка Ліс.

Таміліся нэрвы.

(Паляўнічыя штрыхі).

НІЗКАЕ зімовае сонца здавалася, што яшчэ больш завострывае, і без таго, калючы, сіберны вецер. На возеры трэскаўся лёд. Кусты абглодваліся і ледзяніліся сіверам.

Уночы, за гумнамі, пачыналіся воўчыя піліпаўскія канцэрты. Езьдзіць было боязна—сустракалі на дарозе.

Аднойчы ў канцавога Антося выцягнулі апошнія дзьве авечкі. Ён сам чуў, але—можа па нядбайству, а можа баяўся,—ня вышаў на калатню каля сьцен. А хлявушок быў старэнькі, пахілы, з вышчарбленымі варотамі і зьвіслаю да зямлі страхою.

Мая стрэльба даўно вісела каля печы і чакала „работы". Добрая была „жвыроўка". Любіў за тое, што цэлка біла яна. На вавёрку, зайца, ліса бывала—ня здрадзіць...

Вось і цяпер яна павінна была саслужыць мне—улажыць ня зайца, а воўка.

Здарыўся выпадак. Тамаш прыбег да мяне ўхату:

— Хоць людзям не шанцуе, затое шанцуе нам—паведаміў ён—у Бэркі, падарозе з Менску здох конь. Шкуру ён садраў, а мяса ляжыць у Вінцэсявым хмызьняку.

Згадзіўшы ён дадаў:

— Трэ' было-б яго прывезьці.

Пад вечар мы прывязьлі падлу і расьсеклі напал. Я сваю частку вывалак за гумно крокаў на трыццаць ад току.

Пасьля гэтага мне давялося вартаваць у гумне. Але воўк таксама хітры. Дзьве ночы я так вартаваў, а ён пакажыцца, ды блізка не падыходзіць.

Мяне ахапіла роспач. Але і тут узяў верх паляўнічы запал.

На трэцюю ноч, пратапіўшы ёўню, пайшоў таксама папільнаваць.

Сяджу. Ціха.

Праз вузенькае высечанае ў сьцяне аконца спалохам мігцяць халодныя зоры. Здаецца, яны жмурацца і дрыжаць ад таго, што іх абдымае марозны далёкі прасьцяг. А яны адзінокія такія і сумныя. Вось адна мільганула чырвоным пояском і зьнікла.

Раптам—гэтую марозную цішыню прарэзаў доўгі, працяглы, нудны і галодны голас. Зараз-жа яго падхапілі многія другія і зьліліся ў адзін жудасны голас. Ён то падымаўся, то апускаўся і мерна цягнуўся, залазячы нейкім шчымлівым холадам у нутро.

Напружваюцца нэрвы.

Вочы кідаюцца за ваконца. Узьнятае выбражэньне ловіць нават скрыгат зубоў.

— Можа прышлі?..

Але нікога няма. Падла ляжыць адна. Галасы заміраюць, і зноў сьціскае цішыня сваімі войстрымі абнімкамі.

Узяла цяжкая ўтома і адчуўся холад. Я нацягнуў больш кажух. Тады ахапіў цёплы супакой і галава панура апусьцілася ў каўнер...

Раніцаю я выйшаў паглядзець на прынаду. Проста выйшаў, ня думаючы ні аб чым і не падазраючы, што ўсё-ж такі пабываў госьць. Але якое-ж маё было зьдзіўленьне, калі я ўбачыў, што мяса патузана, паразрывана, а вакол накрыжавана воўчымі сьлядамі.

— Праспаў!—падумаў я.—Пачакай-жа—яшчэ прыдзеш канчаць...

У гэты дзень я чуць дачакаўся вечара. Нават не пасьпеўшы павячэраць я ўжо сядзеў каля ваконца.

— Мой будзеш!—са злосьцю паўтараў я.

Ваўкі ня вылі. Яны ўжо ведалі пра прынаду і трымаліся ціха.

Час ішоў. Цягнуўся нудна. Таміліся нэрвы.

Нават закрадвалася сумніва:

— А што, калі ня прыйдзе?..

Толькі гэта я хацеў паправіцца, перамяніць месца, як раптам—нехта правёў зеленавата-сінім агоньчыкам.

— Ён!—стукнула ў галаве.

Неўзабаве каля прынады заварушыўся цьмяны клубок. Сэрца калацілася. Чамусьці прапала надзея і на стрэльбу і на вока. Але неяк несьвядома хацелася ня верыць гэтаму, а толькі ўжо думалася:

— Хаця-б пістон ня здрадзіў...

Нацэліўся. Пацісьнуў паўкорч.

Рэзка, з кароткім рэхам прагучэў стрэл.

Яшчэ адна напружаная хвіліна:—„ці забіў„?

Але шэры клубок падскочыў, круцянуўся і хутка закавыляў да лесу.

— Прамахнуў,—падумалася.

Я выскачыў з гумна. Кінуўся ўсьлед.

— Мурза! Мурза!—крычаў я.

З сабакам мы кінуліся па сьлядох. Мурза забег наперад. Прабегшы некалькі гоняў я пачуў, як з некім уперадзе браўся Мурза. Гэта ён ірваў за лыткі абясьсіленага ваўка.

---

* * *

Прабыўшы гадзіны тры з хворай і не дачакаўшыся Пятруся, Антаніна парашыла ісьці дахаты.

— Прайдзіся, Сымонка, з Антанінай, каб ёй ня боязна было ісьці,—шэптам пазвала хворая Мар'я свайго шаснаццацігадовага сына.—Толькі варочайся хутчэй.

На палове дарогі Антаніна сказала Сымону:

— Ну, цяпер ты можаш вярнуцца да маткі. Тут я ўжо ня буду баяцца. Дайду як-небудзь.

У цемені заблішчэў агонь сваёй вёскі. Нехта рана устаў, каб зрабіць якую небудзь работу па гаспадарцы. Антаніна пашла хутчэй, кутаючыся ад сьнегу ў каўнер кажуха. Каля Шыкуновага гумна прыпынілася: сьпіць цяпер Пятрусь, ці не, і чаму ён ня прышоў у Іванічы...

Чырвоны сноп агня бліснуў ад гумна, потым вострая боль кальнула ў грудзі, галаву. Антаніна бяз стогну асела на мяккі сьнег, раскінула ў бакі рукі. І ўжо губляючы прытомнасьць адчула, як праз сон, нейкі нечалавечы крык, ні то стогн, а ў ваччу затуманеных блізкаю сьмерцю, мільганула і раптам зьнікла схіленая над ёю постаць.

Нябачныя ў цемені сьняжынкі нячутна ападалі на зямлю, выбельвалі забруджаную саньмі і капытамі коняй дарогу...

Алесь Жаўрук.

Ліст

Дваюроднаму брату—
паляўнічаму.

Здароў мой сябра, ціхі і вясёлы!
(Выбач, даўно ўжо здэцца ня пісаў!)
Вітаю ваш калгасаўскі пасёлак
І зноў зацьвіўшы ябланавы сад!

У вас зіма і ў сьнезе срэбна-белым
Палі васеньніх і апусьцелы лес
І п'яны вецер, троху ашалелы
Надзьмуў сумёт праз шчыліны у хлеў.

О, ты чакаў кашлатыя завеі
З іх першабытнай, кволаю красой...
Я знаю: толькі срэбраная веянь
Лягла парошай першай на пясок

Ты перакінуў стрэльбу цераз плечы,
Гумліва сьвіснуў жвавых ганчакоў...
І лыжы зыбкія пашлі сьнягі калечыць,
І зрок напружана ўглядаўся навакол.

Ты крочыў ў далеч горды і ўрачысты,
Дзе па-пад рэчкаю застыў разуты гай,
І заліваўся яхканьнем клясычным
Паджары твой, тургенеўскі Пегас...

А у грудзёх—гарэў запал юнацкі
І ўсе шпарчэў крыві шалёны рытм...
Чакай, чакай!—у першы дзень вакацый
К табе я ў браму стукну на зары!..

І пойдзем мы на зыбкіх лыжах разам
Ледзь затрапеча ў кволым цьвеце рань...
І заяц выскача спалохана-бялясы—
Я прыкладуся к стрэльбе й раптам—тр-рах!!!

І кроў зьвярыная сумёт акармазыніць...
Раскосы заяц затрапешча ледзь...
У экстазе моцна сьцісьнеш руку ты мне,
Што паляўнічы сэрцам твой Алесь...

Чакай... чакай... А покуль, вечарамі
Над кіпай кніг, конспэктаў і цытат...
І кожны дзень—пароша слоў ня; наных
І мудрых формул кованая сталь.

І ў кожны дзень вялікіх, творчых будняў
За справу нашую гатовы кроў праліць,
Каб вырасталі вышай Асінбуды,
Каб дымны трактар ўзорываў палі.

Каб зацьвіла зямля у вольнай працы,
Каб вечны крыж паставіць на старым...
. . . .
Бывай, бывай! а ў першы дзень вакацый
К табе я ў браму стукну на зары!

Сьнежань 28 г.



З дабычаю.

Ник. Филипович.

По рекам нашего Союза.

(От нашего корреспондента).

Волга и Ока.

Берега Волги красивы и разнообразны. Это разнообразие берегов делится на два основных вида: на так называемые, „Правый" и „Левый" берег. Правый берег горист и крут. Левый-же, в противоположность правому, отлогий и песчаный. Это своеобразное разделение берегов бесконечно тянется почти на $^2/_3$ расстояния всей Волги, иначе говоря от слияния с Окой и до самого своего устья, Каспия. Волжские рыболовы по разному смотрят на каждое, из двух разделений, берегов,

Естественно, что у правого, более крупного берега, дно реки, от поверхности, входит гораздо глубже, чем у отлогого левого, где берег образует переход в дно медленно и постепенно. Благодаря такой разнообразной противоположности берегов, у каждого из них водится „своя" рыба. У правого берега, в глубокой воде, водится преимущественно крупная рыба. У отлогого-же левого берега „мелкота" и „средняк".

И если у „правого" ловят способом „крючка", то у левого берега, в большинстве случаев, способом „сетки".

В средней части и в начале верховья Волги, способ „сетки" преимуществует над „крючком".

Огромное количество зарегистрированных рыболовных артелей, не говоря уже об одиночках-любителях, занимаются ловлей способом „сетки".

Но не надо смешивать две, отдельно стоящих, особенности, т.-е. те возможности, которыми обладает рыбак-любитель и организованная рыболовная артель, лов для которой является профессией.

Ясно, что рыбак-одиночка, ловя бреднем, не всегда имеет возможность отойти от берега, немного ближе к середине реки и обхватить бреднем большую ее площадь, в то время как артель, при наличии моторных катеров или больших лодок, обладая длинным и крепким неводом или сетью, завозит ее как можно дальше от берега, где водится, понятно, и крупная рыба, и уже потом, захватив известную площадь, начинают суживать постепенно ее к берегу и после, при помощи физической силы членов артели, делают выброд на отлогий берег. Ясно, что такой способ, при наличии хорошего берега, позволяет удачней и целесообразней развернуть рыбную ловлю на левом берегу. Если на левом—хозяйничают артели, или организованные любители, то на правом берегу встречаются больше любители-одиночки со своими удочками, подпусками, троезубцами и. т. п.

Правый берег неудобен для ловли сеткой, а особенно большими сетями, т. к. дно покрыто затонувшими карягами и крупными камнями, грозящими захватить или сильно порвать саму сетку.

Ока своими берегами немногим отличается от Волги, а также и в отношении водящейся, в ней, рыбы. Разве только преобладание мелкой рыбы, как плотвы и окуней, и сравнительное отсутствие крупной—сом, белуга, лещ—„крупняк". Но все-же рыболовство на Оке сильно развито, правда, там не такое количество больших артелей, как на Волге, а, главным образом, одиночки и только начиная от города Павлова, и уже до самого верховья, до Мурома, начинают появляться артели, промысла и другие виды организованного рыбного лова.



М. Вилькобриский.

Как охоторганизации построят тир.

ДЛЯ тренировок, занятий, проведения стрельб и состязаний необходимо иметь такое место, которое гарантировало-бы безопасность стрельбы. Для этого строится тир.

Его устройство очень примитивное, средств уйдет незначительно, только необходимо иметь в районе человек 5—6 с инициативой, которые при маленькой поддержке сумеют построить тир.

Что для этого нужно?

Надо найти где-либо за огородом или за сараем естественный ров длиною в 50 или даже больше метров; сговориться с Райсоветом Осоавиахима о помощи для оборудования тира, как живой силой, так и несколькими рублями; своими силами на протяжении этих 50 метров, сравнять землю, срыть кочки, уравнять площадку для стрельбы. Всю землю надо выбрасывать наверх, что образует насыпной вал вдоль всего тира.

Хорошо было-бы уровненные стенки рва укрепить, чтобы они не осыпались, что можно сделать, обложив стены дерном, кладя дерн кирпичной кладкой, то-есть травой вниз, уступами, или же оплесть стены рва, подперев этот плетень к стенке кольями, вбив их в землю и связав верхние концы кольев (см. рис.). Высота рва должна быть не меньше 2—3 метров, а высота вала, в который будут стрелять, должна быть 4 или 5 метров толщиною, а у вершины до 1 или $1^1/_2$ метра.

Насыпая вал для мишеней, необходимо его слегка утрамбовывать и в процессе дальнейшего существования тира часто подсыпать и подправлять.

В случае, если подходящего рва по близости не будет, то можно тир сделать и на открытом, но более пустынном месте. Для этого необходима ровная площадка длиною 50—100 метров, шириною 15—20 метров.

Для безопасности необходимо будет принять ряд предохранительных мер: надо посыпать вал, беря землю за валом высотой в 5—6 метров, имея его ширину, выходящую на 1 или $1^1/_2$ метра за боковые границы стрельбы, закругляя концы вала.

Если на этом пустыре есть высокий забор, или стена заброшенного сарая, то можно сделать так на $^3/_4$ метра от стены вкопать две пары бревен

Сура и Казанка *).

Сура, небольшая река, впадающая в Волгу почти на границе Чувашской республики и Нижегородской губернии у местечка, так называемого Василь-Сурска.

Несмотря на свою незначительную величину, Сура имеет огромное значение, как рыбная река. Сурская стерлядь, как одна из лучших, успешно конкурирующая на рынках Приволжья с Волжной и даже с Ветлужской стерлядью, славится своей величиной и особенным вкусом на всю центральную Россию и даже в центре рыбных промыслов на низовьях Волги, у Астрахани. Извиваясь узенькой лентой, с одинаково ровными берегами, покрытыми небольшой растительностью, Сура протекает между многими крестьянскими селеньями, рыбный лов для которых является хорошим подсобным заработком. Ежедневно маленькие пароходики, курсирующие по Суре, привозят к ее устью, к Василь-Сурску, большое количество рыбы, собранной у крестьянских артелей, и преимущественно стерляди. На пристанях, Василь-Сурска, стерлядь обкладывается льдом, и уже регулярными (по 2 по 3 раза в день) рейсами, больших астраханских пароходов, развозится во все концы Поволжья и на Каспий. Ловят на Суре, большей частью, способом „сетки“ и только в виде исключения можно встретить „крючок“.

За последние два летних сезона уловы на Суре сильно уменьшились, по сравнению с предыдущими. Это об'ясняется, отчасти, сильным обмелением Суры, в некоторых, наиболее рыбных ее местах.


Река Казанка, впадающая в Волгу, немного выше гор. Казани (Т. С. С. Р.), огромная противоположность Суре и всем другим рыбным рекам.


Несмотря на большое свое протяжение и удачную глубину, рыба в Казанке почти отсутствует, а если есть, то исключительно „мелкота“ в виде плотвы. Много лет тому назад, еще во времена владычества татарских орд в Казани, Казанка была мощной, многоводной рекой, с большими притоками, как р. Булак, и с изобилием рыбы.

Но теперь, приток Булак почти совсем высох, а сама Казанка с массой настроенных на ней плотин и различных запруд, тоже пошла на убыль.

Одна из причин, мешающих развитию в ней рыбы, это тот мазут и другие химические отбросы, которые выбрасывают в Казанку, построенные на ее берегах, фабрики и заводы.

*) Притоки Волги.






Река Лучеса (сверху).
Нева у Ленинграда.

между которыми положить бревна или доски. Промежуток между положенными бревнами (или досками) засыпать землей (см. рыс.).

В процессе работы тира, нужно будет заменивать, или же забивать те места, где пули пробивают эти доски.

Надо будет досыпать и землю. На том месте, откуда будут производить стрельбу, необходимо вы-



рыть канавку, или же небольшой загородкой обозначить линию огня. Эта-же канавка или загородка обозначит и края, за которые стреляющие не должны выходить.

По линии огня во время стрельбы, кроме стреляющих, никто не должен находиться (кроме обучающего или инструктора), дабы не мешать стреляющим и избегать несчастных случаев. Для стрельбы же со стэнда, по тарелочкам, требуется открытое место, не стесняющее полета тарелочек.

Для этого тир во рву не годится, а годится тир, сделанный на открытой, ровной площадке. Здесь стэнд должен быть у вала, а в 25—30 метрах от вала по направлению к линии огня должна находиться машинка для пуска тарелочек, для которой необходимо вырыть маленький блиндаж.

Блиндаж должен быть такой глубины, чтобы не видна была машинка и чтобы не стеснялся ничем полет тарелочек.

Чтобы стены блиндажа не осыпались, необходимо одеть дерном или плетнем.

Устройство стэнда, расстояние, установка машинки для пуска тарелочек—требует уже человека хорошо знакомого с этим видом тренировочно-охотничьей стрельбы, могущего лично дать указания, установить машинку, руководить стрельбой и т. д.

Оборудование такого открытого тира заключается в следующем:

1. Два-три легких переносных барьера, для обозначения мест стреляющих, что, конечно, лучше канавки и отделяет стреляющих от нестреляющих. (Когда средства ограничены, то можно обойтись и без барьеров).

2. Фанера для наклейки на них мишеней при стрельбе из мелкокалиберной винтовки или охотничьего ружья.

3. Машинки для пуска тарелочек (одиночные). Если есть машинки для пуска тарелочек двойного полета („дуплет“ „бекас“), то, конечно, ставить и эти машинки.

4. Стол для тряпок, смазки патрон, который надо иметь сзади линии огня.

5. Маты (соломенные) для стрельбы. Мешки (небольшие) с опилками для стрельбы с упора.

В тех районах, где есть помещения более или менее свободные, то можно сделать комнатный тир.

При комнатной стрельбе, чтобы не портить стены, нужно достать железные плиты, толщиною в 1 диаметр и повесить их на стену, предварительно прикрыв эти плиты, плотно сколоченными досками, чтобы не было рикошетов, т.-е. отскакивания пуль от плит.

Можно также прикрыть стену ящиком, сколоченным из вершковых досок, с насыпанным внутрь слоем песку толщиной не менее 1/3 метра. Не плохо, если внутри, ящик обит железом или материей, что предохранит песок от высыпания через щели.

Устройством такого рода примитивных тиров в районе и округе секции сумеют развернуть стрелковую работу, особенно в период подготовки к стрелковым состязаниям. Нужна только инициатива, желание и самодеятельность, чем, конечно, широкие массы охотников-стрелков обладают.

О ловле сеткой в Казанке даже не приходится и говорить, а из „крючков“ можно упомянуть только простую удочку, т. к., при всем безрыбьи, слабое течение не позволяет развернуться даже подпуску. Берега Казанки ровные, луговые и тянутся, почти без изменения, от истока до самого впадения ее в Волгу.

Лучеса *).

Лучеса, пересекая Витебский округ, сливается с Зап. Двиной недалеко от самого города Витебска.

Протекая через густо населенный край округа, сравнительно небольшая Лучеса приносит много пользы деревням и отдельным хуторам. Не говоря уже о той пользе, которую она приносит, заливая весной прибрежные луга, рыбность Лучесы служит хорошим подспорьем в крестьянском хозяйстве, среди которых, кстати говоря, встречается много опытных и заядлых рыболовов. Берега Лучесы, отчасти лесистые и отчасти луговые способствуют развитию рыбы. Сама-же река с извилистыми берегами, с разнообразными и наредкость удобными заливами, позволяет развить на ней почти все виды рыбной ловли. Поэтому неудивительно встретить, на берегах Лучесы, на ряду с блесной и сетчатый бредень.

Рыба в Лучесе, главным образом, „средняк“, тут и щучки, окуни, ерши, подлещики, лещи, налимы, головни, но в некоторых местах реки, в более тихих—так называемых „заводнях“, встречаются и крупные щуки, иногда достигающие 15-25, и более, килограмм.

*) Лучеса—приток Западной Двины Витебский округ БССР.

Нева.

Нева вытекает из холодного Ладожского озера и, пересекая ленинградскую область, впадает в Финский залив у самого города Ленинграда.

Характерно многим рекам, Северо-Западной области, дно Невы каменистое, или имеет твердый грунт. Это и является главной причиной, препятствующей развитию в ней рыбы. Кроме того, местами, как например в Ленинграде, Нева выложена гранитом и это окончательно заставляет более крупную рыбу уйти в Финский залив. Только мелкоте удается уживаться в Неве и то в некоторых местах ее, где меньше гранита и более мягче грунт дна.

Устье Невы является наиболее ее рыбным местом. Каждый праздничный день сотни жителей Ленинграда усеивают этот район своими удочками и подпусками.

В целом-же Нева не рыбная и только такие отдельные места, как ее устье, позволяют появиться самому первичному состоянию рыбной любительской ловли.



В. Е.

Болезни рыб.

СРЕДИ рыб распространены самые разнообразные заболевания. Особенно опасны заболевания заразные, которые, принимая зачастую характер настоящих эпидемий, наносят существенный урон запасам рыб в водоемах.

В настоящем очерке мы остановимся только на некоторых наиболее серьезных болезнях рыб. Одной из наиболее распространенных болезней является, так называемый, *фурункулез* рыб. Эта болезнь наблюдается чаще всего у форелей и лососей. Вызывается она бактерией, называемой по латински bakterium salmonicida (бактериум сальмоницида). Начало заболевания характеризуется воспалением кишек и брюшины. По всему пищеварительному тракту в слизистой оболочке появляются язвы, которые переходят в нарывы. Содержимое таких нарывов или фурункулов состоит из гноя, крови и большого количества бактерий, вызывающих эту болезнь. Вторичным признаком фурункулеза является появление иногда на коже, жабрах и плавниках кровавых пятен. Бактерии salmonicida особенно сильно размножаются при загрязнении прудов и рек, тогда, когда увеличивается процесс гниения органических веществ в воде. Часто наблюдается фурункулез также в живорыбных садках, где рыбы живут в тесноте без достаточного притока кислорода. Рыбы, пораженные фурункулезом, в большинстве случаев погибают.

Так называемая *карповая краснуха* поражает карпов, линей и других рыб из семейства карповых. Рыбы, заболевшие краснухой, покрываются с боков и брюха красноватыми пятнами. Эта краснота обуславливается расширением и переполнением сосудов кожи. Болезнь сопровождается воспалением слизистой оболочки кишечника. Краснуха вызывается особой бактерией, находящейся во всех органах и крови. Также, как и фурункулез, краснуха появляется обыкновенно у рыб, живущих в грязных водах, зараженных гниющими веществами. Бактерии краснухи проникает в тело рыб через кишечник. Болезнь тянется очень долго, неделями, но в конце-концов рыбы погибают массами. Признаками заболевания являются вялость движений, малоподвижность, истощение. Часто рыбы ложатся на поверхности воды на бок и в таком положении издыхают. Краснуха угрей давно известна в датских водах Балтийского моря и в Италии. Она выражается в красноте вокруг анального плавника, на брюхе и на плавниках. Течение этой болезни молниеносное, наблюдающееся обычно знойным летом. У карповых же рыб наблюдается особое заболевание, известное под названием *приподнятой чешуи*. У заболевших рыб приподнимаются чешуйки, особенно на хвосте, при чем они принимают в конце концов почти вертикальное положение. Чешуя выпадает и на этих местах образуются язвы и кровоподтеки. У больных рыб учащается дыхание, они постепенно слабеют и через несколько дней умирают. Эта болезнь вызывается бациллом чумы раков. Он находится в крови больных рыб. Раки, зараженные бактериями от больных этой болезнью рыб, заболевают чумой.

Лососи заболевают часто *чумой*. Эта болезнь принимала иногда характер настоящей эпидемии в Англии и Шотландии. Бактерии чумы лососей лучше всего развиваются в холодное время года. Язвы на теле больных чумой рыб покрываются обычно плесневыми грибками, почему ранее и считали причиной этой болезни именно плесень. У плотвы наблюдается *желтуха* или желтая чума. Впервые эта болезнь была замечена в Цюрихском озере в Швейцарии. Тело покрывается бледно-желтыми пятнами, между которыми появляются и красные пятна. Во внутренних органах изменений не наблюдается.

Среди рыб распространено заболевание и *туберкулезом*. Но туберкулез рыб отличается от туберкулеза людей и взаимного заражения произойти не может. Туберкулезный бацилл рыб хорошо развивается при температуре 10—30° С, при 34° С его рост совершенно прекращается. Этим он и отличается главныт образом от туберкулезного бацилла людей.

Помимо рассмотренных болезней у рыб наблюдается также и ряд других заболеваний как заразных, так и не заразных, но остановиться на всех болезнях здесь не представляется возможным.

Нас паведамляюць.

На Гомельскім рыбаводным заводзе Полацкай акругі заканчываецца інкубацыя чудзкага сіга і рапушкі ў ліку 35 мільёнаў штук, якія будуць засяляцца ў вадаёмах Беларусі.

* * *

На рыбаводных заводах і станцыях мяркуецца вывесьці штучна ўвясну гэтага году 56 мільёнаў рознай каштоўнай прамысловай рыбы.

* * *

Наркамзем прыступіў да складаньня праэкту пабудовы копанковай гаспадаркі на Мазыршчыне, плошчаю каля 2.000 гэктараў.



Жыцьцё на мясцох

Міх. Шмідт.

Пратаколы сьведчаць

аб нашых пасяджэньнях, разглядаемых на іх пытаньнях, прысутнічаньні членаў Праўленьня і ім роўных.

ПЕРАДА мною справа з пратаколамі пасяджэньняў Акруговых Праўленьняў Саюзу Паляўнічых. Іх штук 15 і ўсе яны маюць шмат цікавага для нашага чытача матар'ялу, ня так з мэтаю абмену вопытам, для навыка, як выяўленьне нашых непрактычных пастаноў, перагружанасьць пасяджэньняў і г. д.

Пачну з разгляджэньня пытаньняў, якія стаяць на парадку дня пасяджэньняў:

Менскае Акруговае Праўленьне (пратакол № 1 ад 11 студзеня гэтага году); на адным гэтым пасяджэньні было разгледжана 31 пытаньне. Падумаць толькі... 31 пытаньне! і ня дзіва, калі па многіх з іх прымаюцца такія пастановы, як „лічыць мэтазгодным арганізаваць“, „лічыць неабходным арганізаваць“ і г. д. і г. д. Такіх пастаноў „лічыць мэтазгодным“ мы ў 1-м пратаколе знаходзім 6—7.

У гэтымжа пратаколе па пытаньню: „разгляд пратаколу Белкахотсаюзу ад 6-га сьнежня 1928 г. за № 31“ мы знаходзім такую пастанову: „Лічыць мэтазгодным арганізаваць сэкцыю пры Акруговым Праўленьні і раённых колектывах, прасіць Цэнтральнае Праўленьне Саюзу аб высылцы палажэньня аб працы культурнай і стралковай сэкцыі, пасьля чаго паставіць пытаньне аб арганізацыі сэкцыі пры Праўленьні....“ [1]). Такая пастанова вынесена Праўленьнем у тэй час, калі Акруговае Праўленьне працуе ў адным памяшканьні з Цэнтральным Праўленьнем.

Аб чым гаворыць пастанова—„прасіць.... аб высылцы палажэньня“, ці нельга было-б перад гэтым узяць гэта палажэньне ў Цэнтральным Праўленьні і не прасіць „аб высылцы“. Гаворыць яно аб тым, што большая частка сакратароў Акруговых Праўленьняў сядзяць не на сваім мейсцы, ня ведаюць сваіх абавязкаў і займаюцца ня тым, чым патрэбна ім займацца.

Нікому не сакрэт, што ў нас большая частка Акруговых Праўленьняў мае так званых ганаровых старшынь, якія перагружаны іншай партыйнай, савецкай і грамадзкай працаю і што фактычна ўсю працу Праўленьня, як арганізацыйную, так і ўсю астатнюю павінны выконваць сакратары Праўленьня, а гэтага мы пакуль што ня бачым. Большасьць сакратароў Акруговых Праўленьняў лічыць сябе толькі тэхнічнымі працаўнікамі, лічучы, што ім трэба толькі фіксаваць пратаколы на пасяджэньнях, а каб падрыхтаваць пытаньне да пасяджэньня, думаюць ня іх справа. Таму ў нас выносяцца такія непрактычныя пастановы і таму ў нас на адным пасяджэньні разглядаюць па 30–35 і больш пытаньняў.



Выезд на аблаву. (Мен. акр., Шацк р.).

Мне могуць задаць пытаньне, „можа 30 або 35 пытаньняў, якія разглядаюцца на адным пасяджэньні, не такія ўжо сур'ёзныя?“. Калі ня лічыць важнымі такія пытаньні, як арганізацыя сельскіх ячэек, кас узаемадапамогі і ім роўныя, дык тады гэта так, але-ж мы лічым, што яны надта важныя і разглядаць іх трэба як належыць быць і не на такім пасяджэньні, калі разглядаецца 31 пытаньне.

Полацкае Праўленьне (пратакол № 1 ад 15 студзеня). З усіх членаў, кандыдатаў Праўленьня і Рэўкамісіі, на пасяджэньні прысутнічала толькі 3 чалавекі, разгледжана 23 пытаньні. З самага пачатку прыняты пастановы па розных актах, пратаколах і заявах і толькі 20-м пытаньнем разгледжана такое важнае мерапрыемства Белкахотсаюзу, як проэкт палажэньня аб сельскіх ячэйках, якое павінна наблізіць усю працу паляўнічай каапэрацыі да масы,

[1]) Вытрымкі з пратаколаў Акруг. Праўл. друкуюцца без усялякіх стылістычных і іншых зьмен.

прыцягнуць яе да практычнае творчае працы ў арганізацыі. Ня дзіва, калі пасьля гэтага выносіцца такая пастанова: „З праэктам палажэньня згадзіцца". І чаму не „згадзіцца", калі нехта яго напісаў і прыслаў проэкт у Акруговае Праўленьне. З чалавекі абгаварыла, і лічаць, што наконт арганізацыі сельскіх ячэяк, паляўнічая маса сказала сваё слова.

Мабыць такая пастанова была вынесена таму, што члены Праўленьня стаміліся (?!)... тады „іншая" справа. Нам гэта пакуль што не вядома. Вядома толькі адно, што праэкт арганізацыі сельскіх ячэек, які пасылаўся на мейсцы для абгаварэньня на сходах паляўнічых, далей Акруговага Праўленьня нікуды не пашоў.

Мы лічым, што такое важнае пытаньне павінна было-б на апошнім абгаварвацца з больш практычным і жыцьцёвым вырашэньнем.

Бабруйскае Акруговае Праўленьне. Па яго пратаколам відаць, што пасяджэньні Акруговага Праўленьня бываюць толькі адзін раз у месяц (пратакол № 13—ад 13/X; № 14 ад 14/XI; № 15 ад 19/XII). Чым-жа карысным займаліся, зьбіраючыся раз у месяц? А вось чым:

Слухалі: 1. „Даклад т. Ешчыка аб неабходнасьці вылучэньня Члена Праўленьня для вядзеньня культасьветнай працы... *Пастанавілі:* аставіць пытаньне покуль што адчыненым. Кожнаму Члену Праўленьня павесьці перагаворы з падыходзячымі асобамі аб паступленьні іх на працу культурніка".

Застаецца чакаць яшчэ месяц да наступнага пасяджэньня. Дачакаліся „дзякаваць богу" пакуль праз месяц з лішкам сабралася Праўленьне. І што-ж вы думаеце, абгаварвалі гэта пытаньне? не, нават па пратаколу пасяджэньня, якое адбылося праз 3 месяцы, аб культпрацы яшчэ не прамовіліся. Пытаньне, як відаць яшчэ „покуль што адчынена". Зіма,—час разгортваньня культпрацы праходзіць, і нічога ня зроблена.

Ня менш цікавым для нашага чытача рашэньне аб распаўсюджваньні часопісу „Паляўнічы Беларусі". Па гэтаму пытаньню пастаноўлена: „Як Праўленьню, так і Райбюро прыняць усе крокі к пашырэньню падпіскі на часопіс „Паляўнічы Беларусі" на 1929 год". Ня дзіва, калі пасьля гэтакай пастановы, Парыцкі колектыў паляўнічых (Бабр. акр.), які аб'ядняе каля 200 паляўнічых, сабраў каля 20 падпішчыкаў на часопіс.

Не выбіраючы пратаколаў, бяручы так, як яны ляжаць, праглядваю пасяджэньні *Аршанскага Акруговага Праўленьня.*

Па колькасьці разглядваемых пытаньняў на адным пасяджэньні, Орша стаіць на першым мейсцы. На адным пасяджэньні ад 10 студзеня прыняты рашэньні па 33 пытаньнях.

Пасядзелі... папацелі... пастанавілі... „§ 33. Слухалі адносіну ЦП Белкахотсаюзу ад 4/I 1929 году за № 12 з проэктам аб сельскіх ячэйках паляўнічай каапэрацыі. Пастанавілі: адкласьці разгляд проэкту да наступнага пасяджэньня".

Што можна сказаць пасьля ўсяго гэтага, што можна сказаць пасьля таго, калі з самага пачатку і амаль да самага канца разглядаліся розныя дробязі, а апошнім 33-м пытаньнем разглядаўся проэкт аб сельскай ячэйцы? Чакаем, што на гэта адкажуць нашы чытачы.

* * *

Да якога выніку мы прыходзім, закрануўшы ўсе пытаньні? Вынік адзін: Большасьць Акруговых Праўленьняў абрана з ганаровых членаў, якія ня могуць рэгулярна наведваць пасяджэньні Праўленьня і таму, зьбіраючыся раз у месяц, прыходзіцца разглядаць па 30 і больш пытаньняў, па якіх выносяцца непрактычныя, няжыцьцёвыя пастановы; большасьць сакратароў Акруговых Праўленьняў ня ведае сваіх абавязкаў і адносіцца да сваёй працы „спустя рукава"; пытаньні, якія стаяць на парадку дню пасяджэньня, раней не падрыхтоўваюцца і г. д. і г. д. Усё гэта мы павінны ўлічыць, і асабліва зараз, калі мы стаім перад перавыбарамі паляўнічых арганізацый.

Д-р Ліопанцэвіч.

Да організацыі колектываў „Воўчая Сьмерць".

У нашай мясцовасьці, хоць і ў малай колькасьці, але ўсё-ж водзяцца ваўкі. Ходзяць яны па аднаму, па два, зачастую можна спаткаць групы ў 5—7 штук. Шкоды яны ўтвараюць нямала: там, чуеш, авечку панеслі, цяля, а там залезьлі ў стадка і выразалі 6—8 авечак. Выходзячы на паляваньне на зайцоў, прыходзіцца зачастую чуць заўвагі пакрыўджаных сялян: „зайцоў умееце біць, а ваўка хаця-б аднаго забілі".

Што можа зрабіць адзін ці два паляўнічых? Хіба выпадкова наскочыць на соннага альбо выючага ваўка? Але гэта здараецца раз у 10 год і, такі шчасьлівец апавядае пра сваё шчасьце шмат год усялякаму сустрэчнаму, другам, дзецям і г. д.

У разброд, адзінкамі ваўкоў ня выжыць. Трэба організоўваць гурток. На гэту справу пяцера паляўнічых адгукнуліся. Сабраліся і сталі думаць, як быць, з чаго пачаць. Організоўваць вялікія аблавы ня варта: акружыўшы ваўкоў покуль зьбярэш паляўнічых і крыкуноў—глядзіш і вечар, альбо, сабраўшыся, ўзьнімуць такі крык, шум, што і ваўкі паўцякаюць ад страху. Невялікая група больш рухомая заўжды можа быць падрыхтована да бою. Але без флажкоў не абыйсьціся. Парашылі пачаць з флажкоў. Сродкаў гурток ніякіх ня мае. Парашылі сабраць рызьзё, рушнікі, абрусы, сарочкі. Прынесьлі хто колькі змог. Заселі за працу: хто стужкі рве, хто фарбуе чырвонай фарбай, хто прышывае да шпагату.

Пад канец усё-ж як-небудзь змайстравалі адну вярсту флажкоў. Самі зрабілі катушку, змоталі, глядзіш, вярста флажкоў ёсьць, аж весялей стала. Час прыступаць да працы. Не, яшчэ, пачакайце, умова: першых двух ваўкоў на патрэбы гуртка, з астатніх палова, ды яшчэ па тры рублі сяброўскіх узносаў. Усе згодны. Цяпер да справы. Павінен вам сказаць, што ўсе мы пяць чалавек ваўчатнікі, што завецца „ад грому".

